камунікаты

**Валерый Шэйфер**
(Гародня)

# Вялікі пералом. Масква – Вільня ў барацьбе за гегемонію ва Усходняй Еўропе ў XV-XVI стст.

Перыяд 1449 г. – першай трэці XVI ст. можна назваць пераломным у гісторыі Усходняй Еўропы. Гэта час змены лідэра ў рэгіёне і пераходу ініцыятывы ў справе збірання ўсходнеславянскіх земляў ад Вільні да Масквы.

Двухбаковая дамова 1449 г. пра падзел сфераў уплыву на Русі была заключана паміж дзяржавамі з вельмі рознымі эканамічным і вайсковым патэнцыяламі. Ва ўмовах дамінавання аграрнай эканомікі пры прыблізна аднолькава нізкім узроўні развіцця сельскай гаспадаркі крытэрыем магутнасці дзяржавы выступалі памеры яе тэрыторыі. Тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага на сярэдзіну XV ст. была агромністай, але малазаселенай. Каля 2/3 складала насельніцтва ўсходнеславянскіх земляў. У склад яго ўваходзілі землі сучаснай Беларусі, Украіны, Літвы і часткова Польшчы і Расіі. Шляхі ўваходжання былі рознымі: ад заваёвы да дабраахвотнага прызнання ўлады вялікага князя літоўскага. На сярэдзіну XV ст. тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага складала каля 915 906,25 кв. км[1]. Абсяг жа Вялікага Княства Маскоўскага быў усяго каля 430 000 кв. км[2]. У другой палове

[1] Падлік паводле: *Atlas historyczny Polski*, Warszawa 1973, s. 16–17.
[2] М. Н. Тихомиров, *Средневековая Москва в 14–15 вв.*, Москва 1957, с. 176.

XV ст. агромністае Вялікае Княства Літоўскае раптам без усялякага супраціўлення дзеліцца ўплывамі з невялікім Маскоўскім Княствам, якое да таго ж знаходзіцца яшчэ ў васальнай залежнасці (хоць ужо фармальна) ад татараў. Маскоўская дзяржава хоць і з'яўляецца самай магутнай у Паўночна-Усходняй Русі на той час, але ёй яшчэ далёка да поўнага дамінавання ў рэгіёне. Такія імкненні Масквы ні для каго не з'яўляліся таямніцай, і ў першую чаргу для суседніх самастойных княстваў – галоўных аб'ектаў яе экспансіі. Пастаўленыя перад альтэрнатывай: або страціць сваю самастойнасць на карысць Масквы, або шукаць саюзніка для абароны, адны пераходзілі на бок больш актыўнага і мацнейшага (т.зв. Вярхоўскія княствы), другія ўступалі ў саюзныя адносіны з Вялікім Княствам Літоўскім (Ноўгарад, Цвер).

Напачатку ў Вільні, здавалася б, меліся ўсе магчымасці, каб калі не зліквідаваць, дык спыніць маскоўскі наступ на яго сферы ўплыву і прынізіць Маскву да ўзроўню астатніх удзельных княстваў Русі. Аднак насуперак логіцы падзеі развіваліся зусім па іншаму сцэнарыю. Масква ўсё больш мацнела пры яўнай няздольнасці Вялікага Княства Літоўскага яе нейтралізаваць, выпрабоўвала сілы апошняга і ўрэшце, упэўненая ў сваіх сілах, счапілася з супраціўнікам у адкрытай барацьбе, нанесла яму шэраг паражэнняў і здабыла перамогу.

Чатыры дзесяцігоддзі пасля заключэння дамовы 1449 г. прайшло ў амаль несупынных канфліктах, пакуль Масква ўрэшце не рашылася на адкрытую вайну. Але ўвесь гэты час маскоўскімі валадарамі праводзілася „разведка боем”, якая паказала, што ліцьвіны няздольныя арганізаваць эфектыўны адпор. Тады маскоўскі бок распачаў серыю войнаў, у выніку якіх Вялікае Княства Літоўскае не толькі страціла лідэрства ва Усходняй Еўропе, але панесла агромністыя тэрытарыяльныя страты (каля 28% тэрыторыі). Прычынай пачатку войнаў бачыцца сутыкненне інтарэсаў дзяржаваў: як тэрытарыяльных, так і ідэалагічных, а ў больш вузкім сэнсе – пашырэнне межаў Маскоўскай дзяржавы на захад. У 1458–1459 гг. была ўстаноўлена ўлада Васіля II у Вятцы, у 1463 г. Масква далучыла Яраслаўскае Княства, у 1474 г. Растоўскае, 1485 г. Цвярское, у выніку трох паходаў (1456, 1471, 1478 гг.) быў падпарадкаваны Ноўгарад, падначалена (1464), а потым „узята” (1510) Пскоўская феадальная рэспубліка[3]. Па-

[3] И. Б. Греков, *Очерки международных отношений Восточной Европы XIV-XVI вв.*, Москва 1963, с. 157.

глынаючы асобныя самастойныя землі і княствы, Вялікае Княства Маскоўскае перарастае ў цэнтралізаваную дзяржаву і ў рэшце рэшт сутыкаецца з Вялікім Княствам Літоўскім, якое на той час страціла ўжо сваю ваяўнічасць і імкнулася толькі захаваць землі, раней уключаныя ў свой склад.

Мірныя ўзаемаадносіны ў поўным сэнсе слова былі характэрны толькі для перыяду 1449–1486/87 гг. У гэты час захоўвалася больш-меньш раўнавага ў рэгіёне, дасягнутая праз павелічэнне актыўнасці Масквы і некаторыя ўступкі Вялікага Княства Літоўскага пры заключэнні дамовы 1449 г. Пэўную ролю ў захаванні статус-кво на ўсходняй мяжы адыгрываў і аўтарытэт манархаў – Казіміра Ягайлавіча і Івана III. Кароткі перыяд 1486/87–1492 гг. характарызаваўся памежнымі спрэчкамі з выкарыстаннем перабежчыкаў на маскоўскі бок без афіцыйнай аб'явы вайны.

1449 г. можна лічыць пачаткам пералому ў двухбаковых адносінах: Вялікае Княства Літоўскае адмовілася ад актыўнай наступальнай знешняй палітыкі на сваіх усходніх межах. З захопам Масквой Ноўгарада гэты пералом стаў незваротным. Ініцыятыва канчаткова перайшла на бок Масквы. Вялікае Княства Літоўскае заняло цалкам абарончую пазіцыю ў справе аб'яднання ўсходнеславянскіх земляў. Супраціўнік жа мацнеў і выстаўляў прэтэнзіі на ўсе гэтыя тэрыторыі.

У такіх спрэчках маскоўскія князі выкарыстоўвалі два галоўныя аргументы: рэлігійнае першынство (сцвярджалі сябе адзіным прыцягальным цэнтрам праваслаўя ва Усходняй Еўропе, асабліва пасля падзення Канстантынопаля ў 1453 г. і жаніцьбы Івана III з Софіяй Палеалог) і належнасць да дынастыі Рурыкавічаў – князёў былой Старажытнай Русі[4]. Вядомы беларускі гісторык Уладзімір Пічэта прычынай пастулальнай маскоўскай знешняй палітыкі ў заходнім накірунку лічыў эканамічны чыннік. Ён адзначаў, што Маскве ў канчатковым выніку патрэбны выхад да Балтыкі, гандлёвыя шляхі, без якіх цяжка было падтрымліваць сувязь з Заходняй Еўропай[5]. Наўрад ці такое супрацьстаянне магло скончыцца мірам, бо Іван III, а пасля яго сын Васіль III лічылі сябе адзінымі пераемнікамі імперыі Рурыкавічаў і ўладальнікамі „рускіх" (чытай: усходнеславянскіх) земляў. Фар-

[4] У. І. Кананові, *Змаганне за спадчыну Рурыкавічаў*, „Беларуская мінуўшчына" 1997, № 5, с. 2–7.

[5] У. І. Пічэта, *Гісторыя Беларусі*, Масква – Ленінград 1924, ч. I, с. 94; ён жа, *Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве*, Москва 1958, с. 10.

мальна справа была ў „спадчыне Рурыкавічаў" – землях Старажытнай Русі, альтэрнатыўнымі цэнтрамі аб'яднання якіх можна лічыць як Маскву, так і Вільню. Але бакі не прызнавалі адзін за адным такія правы, тым больш што Масква прэтэндавала на сваю выключнасць у якасці такога спадкаемцы. У выніку, разгарэліся войны, у якіх ВКЛ прыходзілася абараняцца ад свайго ўсходняга суседа ці спрабаваць вярнуць ужо страчаныя землі. За часы Івана III і яго сына Васіля III (1462–1533) Маскоўская дзяржава павялічылася да 2,68 млн. кв. км[6], г.зн. узрасла ў 6,23 раза. Да канца XVI ст. яе тэрыторыя павялічылася да 5 400 тыс. кв. км. У сярэдзіне XVI ст. насельніцтва Маскоўскай дзяржавы складала каля 6 млн. чалавек, праз стагоддзе павялічылася яшчэ на 2 млн. чалавек. У пачатку XVI ст. у ёй было 96 гарадоў, у канцы стагоддзя – 170[7]. Насельніцтва ж Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XVI ст. складала каля 2,7 млн. чалавек[8].

Ад часоў першых памежных канфліктаў, а потым ваеных сутыкненняў з Маскоўскай дзяржавай, якія пачаліся з 1486/1487 гг. пасля апанавання Масквой Цверы, тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага істотна скарацілася. Па „вечнаму міру" 1494 г. дзяржава страціла 15 646 кв. км (улічваючы спрэчныя тэрыторыі – 29 437 кв. км)[9]. У шэрагу далейшых войнаў было страчана каля 1/3 тэрыторыі. Найбольшыя страты былі панесены ў вайне 1500–1503 гг., у якой да Маскоўскай дзяржавы перайшло 241 154 кв. км тэрыторыі[10]. Пазней тэмпы прасоўвання маскоўскага ўплыву запаволіліся. Па выніках вайны 1507–1508 гг. да Вялікага Княства Літоўскага адышлі каля 1 388 кв. км тэрыторыі[11]. У вайне 1512–1522 гг. быў страчаны Смаленск і тэрыторыя агульнай колькасцю каля 1623,5 кв. км[12]. У вайне 1534–1537 гг. Вялікае Княства Літоўскае змагло заняць вялікую тэрыторыю (усю Севершчыну), але быў затрыманы толькі Гомель, вернута тэрыторыя каля

[6] А. Г. Кошалеў, *Жывыя і мёртвыя: Маскоўскія вязні пасля Аршанскай бітвы 1514 г.*, „Гісторыка-археалагічны зборнік", 1994, № 13, с. 176.

[7] А. М. Сахаров, *Образование и развитие Российского государства в 14–17 вв.*, Москва 1969, с. 57, 76, 77.

[8] H. Łowmiański, *Zaludnienie państwa litewskiego w XVI w.*, Poznań 1998, s. 225.

[9] Падлік паводле: J. Natanson-Leski, *Dzieje granicy wschodniej Rzeczypospolitej*, cz. 1: *Granica moskiewska w epoce jagiellońskiej,* 1922, s. 195, mapa granic wschodnich.

[10] Там жа.

[11] Там жа.

[12] Падлік паводле: *Atlas historyczny Polski*, Warszawa 1973, s. 20–21.

4 798 кв. км[13]. Такім чынам, у параўнанні з часамі Вітаўта і Казіміра Ягайлавіча тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага паменьшылася амаль у 1,4 разы і склала каля 665 292,25 кв. км[14]. Падчас войнаў канца XV – першай трэці XVI стст. Вялікае Княства Літоўскае страціла больш за 250,5 тыс. кв. км тэрыторыі. Страты склалі каля 28% тэрыторыі[15].

„Старадубская" вайна (1534–1537) падвяла рысу пад перыядам узброенага і дыпламатычнага супрацьстаяння Масквы і Вільні, зафіксаваўшы адносную раўнавагу сілаў і мяжы аж да 1558 г. Аднак ніводзін бок не згадзіўся з існуючым становішчам. Узброеныя сутычкі працягваліся і пасля 1537 г. Нават у 1542 г. Вялікае Княства Літоўскае не прызнавала за Іванам IV тытулу „князь смаленскі"[16].

Верагодных прычын такога развіцця падзей было некалькі:

1. наяўнасць у другой палове XV ст. у Маскве і адсутнасць у Вільні кіруючага цэнтра замежнай палітыкі;
2. большая эфектыўнасць сістэмы мабілізаыі фінансавых і вайсковых сродкаў Маскоўскай дзяржавы у параўнанні з Вялікім Княствам Літоўскім;
3. вышэйшы ўзровень і, адпаведна, большая эфектыўнасць маскоўскай дыпламатычнай службы;
4. асабістыя якасці кіраўнікоў дзяржавы.

Гісторыя часта падае прыклады, калі ў барацьбе двух супернікаў справу вырашае не наяўнасць патэнцыялу, а ўменне яго выкарыстоўваць. У другой палове XV – пачатку XVI стст. Вялікае Княства Літоўскае мела значныя праблемы ў арганізацыі замежнай палітыкі, у тым ліку ў дачыненні да яе апошняга і рашаючага сродка – вайны. На працягу паловы стагоддзя ў дзяржаве фактычна адсутнічаў яе галоўны кіруючы цэнтр у асобе вялікага князя. Персанальная унія Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства прывяла да працяглага знаходжання гаспадара ў Кракаве. Там Казімір Ягайлавіч у якасці польскага караля меў шэраг складанейшых знешнепалітычных праблемаў, якія патрабавалі яго поўнай заангажаванасці. Дастаткова ўзгадаць

[13] Там жа.

[14] Падлік уласны.

[15] Падлік уласны.

[16] *Сборник Императорского Русского Исторического Общества*, т. 59: *Памятники дипломатических отношений Московского государства с Польско-Литовским*, т. 2 (1533–1560), под ред. Г. Ф. Карпова, Санкт-Петербург 1887, с. 147; Р. Казлоў, Р. Цітоў, *Беларусь на сямі рубяжах*, Мінск 1993, с. 13.

13-гадовую вайну 1454–1466 гг. з Тэўтонскім ордэнам, барацьбу Ягелонаў за чэшскі і венгерскі троны і г.д. Гаспадар фізічна не мог адначасова кіраваць замежнай палітыкай дзвюх дзяржаваў і павінен быў выбіраць прыярытэты. Такімі для яго сталі справы Кароны. У адносінах з Масквой вялікі князь імкнуўся захаваць спакой і стабільнасць. Невыпадкова дамова пра падзел сфераў уплыву з усходнім суседам з'явілася праз два гады пасля абрання Казіміра польскім каралём. За гэты час ён зразумеў, што трэба выбіраць, і абраў актыўнасць у Польшчы і спакой на ўсходняй мяжы. Калі ж высветлілася, што спакой утрымаць немагчыма, Казімір па той жа прычыне праваліў усе акцыі, якія патрабавалі прысутнасці і актыўнага дзеяння гаспадара. Войска Вялікага Княства Літоўскага насуперак дамове не прыйшло на дапамогу Ноўгараду ў час рашаючай бітвы на р. Шалоні ў 1471 г., не з'явілася на сумесную выправу з ханам вялікай арды Ахматам у 1480 г. (якую само ж Вялікае Княства Літоўскае і інспіравала). Не змусіла ВКЛ да актывізацыі нават адчайная акцыя наўгародскіх саюзнікаў – просьба сабе намесніка ад Казіміра і згода прысягнуць вялікаму князю літоўскаму. Па тых жа прычынах не дапамагло Вялікае Княства Літоўскае і Цверы падчас захопу яе Масквой. У выніку яно страціла не толькі саюзнікаў, але і ўвесь свой уплыў у рэгіёне. Пасля захопу Ноўгарада і Цверы Масквой шаля вагаў моцна нахілілася ў бок Масквы.

Паны-Рада выдатна разумелі сітуацыю, але нічога не маглі зрабіць, бо не мелі ні праваых падставаў, ні рэальнай магчымасці самастойна весці замежную палітыку ў дачыненні да Масквы. Таму яны пастаянна просяць і патрабуюць прысутнасці гаспадара ў Вільні. У выпадку вайны толькі вялікі князь мог распачаць мабілізацыю шляхецкага апалчэння, а яго прысутнасць у войску была гарантыяй, што большасць ваяроў з'явіцца на месца збору. Калі адсутнасць гаспадара ў краіне стала пастаяннай з'явай, радныя-паны дамагаюцца пераўтварэння вялікакняжацкай рады ў самастойны орган цэнтральнага кіравання, які мог бы функцыянаваць незалежна ад асобы гаспадара, меў правы кіравання краінай падчас адсутнасці вялікага князя. Гэтага ўдалося дасягнуць толькі пад канец XV ст. Новае значэнне Паноў-Рады санкцыянаваў вялікі князь Аляксандр у 1492 г. і паўтарыў Жыгімонт у 1506 г. Менавіта на пачатак і першыя дзесяцігоддзі XVI ст. прыпадае большая актыўнасць і арганізаванасць у дзеяннях Вільні супраць Масквы.

Аднак на працягу другой паловы XV ст., калі новая кампетэнцыя Рады толькі фармавалася, у краіне фактычна адсутнічаў

адзіны кіруючы цэнтр. Якраз у гэты час ён і быў найбольш неабходны дзяржаве. У выніку менавіта тады Масква пераймае стратэгічную ініцыятыву і лідэрства ў рускіх землях.

Немалаважную ролю ва ўзаемаадносінах варагуючых дзяржаваў адыгрвала і міжнародная абстаноўка ва Усходняй Еўропе. На канец XV – пачатак XVI стст. прыпадае пачатак станаўлення еўрапейскай сістэмы дзяржаваў, калі Еўропа ператвараецца з іх сумы ў сістэму, што надае лакальным канфліктам агульнаеўрапейскі характар. У XVI ст. фарміруецца таксама канцэпцыя „раўнавагі сіл", сэнс стратэгіі якой заключаецца ў тым, каб змагацца з найбольш моцным і актыўным, беручы ў саюзнікі слабейшага. Менавіта таму маскоўска-літоўскія адносіны неабходна разглядаць у сувязі з адносінамі гэтых дзяржаваў з такімі краінамі як Польшча, Чэхія, Венгрыя, Малдавія, Свяшчэнная Рымская імперыя Германскай нацыі, Тэўтонскі і Лівонскі ордэны, а таксама з асколкамі Залатой Арды.

Па сутнасці ж Маскоўская дзяржава так і не адмовілася ад „аб'яднання" ўсіх „рускіх" зямель. Вялікае Княства Літоўскае ж не магло прымірыцца са стратай значных сваіх тэрыторый і такім тытулам маскоўскіх цароў, як „гасудар усея Русі". Гэта не магло не быць падставай і для будучых канфліктаў. Падзеі апошняй маскоўска-літоўскай вайны аналізаванага перыяду таксама паказалі, што без знешняй дапамогі ВКЛ няздольнае весці спрэчкі з Масквой ваенным шляхам.